# МАРАЛЬНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

***В.А. СКАЧКОВА***
*Гомельскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»*

Сацыяльная несправядлівасць, пастаянныя крызісы, палітычнае бязладдзе, стэрэатыпы грамадства, немагчымасць самарэалізацыі спараджаюць заняпад маралі сярод моладзі. Шляхі вырашэння гэтай праблемы існуюць – гэта, перш за ўсё, правядзення эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі, асабліва маладзёжнай, ажыццяўлення сацыяльнага кантролю за грамадскай мараллю, рэлігійнымі і палітычнымі ўстановамі, паляпшэння стану такіх грамадскіх інстытутаў, як сям'я і школа.

Нам часта даводзіцца чуць, што сучасная моладзь дрэнная, калі параўноўваць яе са старэйшымі пакаленнямі. Па–першае, моладзь стала лянівая і не хоча працаваць, любіць толькі забавы. Па–другое, маладыя людзі нахабныя і нятактлівыя, не паважаюць старэйшых. Таксама сярод моладзі шмат людзей са шкоднымі звычкамі, наркаманаў. Кажуць, гэта та-

Полесгу

му, што ў сучаснай моладзі маральныя прынцыпы неразвітыя.

Уласна кажучы, з такімі думкамі можна пагадзіцца, але толькі часткова. Моладзь – гэта не ізаляваная частка грамадства, гэта частка нас усіх, частка нашага грамадства. І гэтыя ўсе недахопы уласцівыя не толькі моладзі, але і ўсяму нашаму грамадству. Наадварот, мы часта бачым, як мараллю і прыстойнасцю грэбуюць людзі ва ўзросце сарака–пяцідзесяці гадоў. Такіх людзей ужо да моладзі не аднясеш. Менавіта яны і дэманструюць узор паводзін для маладых.

Асноўныя маральныя прынцыпы і каштоўнасці моладзі павінны быць такія: сумленнасць, прыстойнасць, адказнасць, павага да вопыту старэйшых, энергічнасць у працы. А яшчэ дабрыня, чалавечнасць і згуртаванасць, альтруізм.

Лічым, што тыя маральныя прынцыпы і каштоўнасці, якія былі пералічаны, павінны стаць пуцяводнай зоркай у жыцці маладых людзей.

Наша моладзь цалкам цікавая і разумная. Галоўным недахопам беларускай моладзі, на наш погляд, з'яўляецца эгаістычнасць. Мы назіраем, што многія сучасныя хлопцы і дзяўчаты – эгаістычныя, упэўненыя ў сабе індывідуалісты, сканцэнтраваныя на сабе, на сваіх патрэбах. Нядзіўна, што ўзмацненне канцэнтрацыі на саміх сабе суправаджаецца астуджэннем да пачуццяў і праблем іншых людзей.

Маладым людзям часам, нягледзячы на ўсе свае таленты, цяжка згуртавацца дзеля нейкай цікавай або важнай справы. Бо ніхто не хоча пастуціцца сваімі інтарэсамі дзеля агульнай карысці.

У параўнанні са студэнтамі 60–70–х гадоў, сучасныя маладыя людзі радзей згаджаюцца з такімі сцвярджэннямі, як "я часам спрабую стаць на месца іншых людзей, каб лепш іх разумець", або "я часта шкадую людзей, менш паспяховых, чым я".

Прычыны такой эгаістычнасці трэба шукаць у сямейным выхаванні, у адносінах бацькоў да сваіх дзяцей і адносінах паміж самімі бацькамі.

Віной такой з'явы з'яўляецца таксама інфармацыйная атака. У параўнанні з папярэднімі пакаленнямі, маладыя



Палесдзу

людзі паглынаюць значна больш інфармацыі. Новае пакаленне вырасла на агрэсіўных камп’ютарных гульнях, некаторыя з якіх адымаюць у нас здольнасць адчуваць боль іншых.

Таксама, многае можна патлумачыць з'яўленнем сацыяльных сетак, якія робяць зносіны і сяброўства больш даступнымі, абясцэньваючы іх, а ад праблем сяброў можна адмовіцца, выключыўшы камп’ютар. Не варта забываць і пра ціск з боку сучаснага грамадства, у якім вышэй за ўсё цэняцца поспех, матэрыяльныя дасягненні.

На жаль, многія маральныя каштоўнасці, сфарміраваныя на працягу стагоддзяў, успрымаюцца нашым грамадствам як архаічныя. Сярод моладзі падае духоўнасць, што тлумачыцца перш за ўсе зніжэннем ўзроўню жыцця ў Беларусі, адсутнасцю сацыяльнай абароненасці, відавочным і схаваным беспрацоўем, інфляцыяй, нявызначанасцю маральных арыенціраў у палітыцы дзяржавы і паўсядзённым жыцці. Сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі ўсё больш ўплываюць на грамадства і асабліва на моладзь, прапагандуюць гвалт, зброю, сілу. Усё гэта прыводзіць да адчужэння дзяцей і моладзі ад маралі, падахвочвае іх да ўласных пошукаў самарэалізацыі, і ў рэшце рэшт да пэўнага адмаўленне духоўнасці і маральнасці як грамадска значных феноменаў. Гэтыя працэсы ўзмацняюцца крызісным станам сучаснай сям'і, якая перастае адыгрываць ролю галоўнага канала далучэння дзіцяці да маральных пачаткаў і крыніцы развіцця маральнасці.

Людзі больш сталага пакалення да моладзі ставяцца па–рознаму. Адны кажуць, што варта шанаваць яе энтузіязм, гарачае імкненне да пераменаў. Іншыя зневажаюць яе. Існуе выраз: "Па адносінах да моладзі можна судзіць аб стаўленні да чалавека, да будучыні".

Традыцыйна ў беларускім грамадстве перш за ўсё паважаліся пачуццё любові да бацькоў. Маральным абавязкам дзяцей была дапамога бацькам па гаспадарцы, догляд за імі ў выпадку хваробы. Строга асуджалася народнай мараллю сямейная варожасць; сямейнае жыццё павінна грунтавацца на пачатках шчырай садружнасці, прыгажосці ўзаемаадносін, чалавечнасці, павагі да свайго роду.



ПолесГУ

Наш народ строга прытрымліваўся маральных абавязкаў, перш за ўсё: дапамагаць чалавеку, якога напаткала няшчасце, турбавацца аб дзецях–сіротах, абяздоленых. Шанавалася пачуццё нацыянальнай годнасці, агіда да фізічнага і духоўнага рабства. Вялікай ганьбаю лічылася нацыянальная здрада і адрачэнне ад роднай мовы.

Слова занадта шмат значыць у чалавечым жыцці. Як вядома, можа паўплываць нават на лёс. Яно імгненна мяняе настрой, робіць шчаслівым або няшчасным, радасным або прыгнечаным. Родная мова – гэта канцэнтрацыя мудрасці і вопыту продкаў. Адмаўленне ад яе вядзе да парушэнняў грамадскай гармоніі, законаў чалавечай эвалюцыі.

Страта народам мовы – гэта трагедыя ўсіх трагедый, бо тады губляецца ўвесь папярэдні вопыт, зафіксаваны ў ёй. Культура мяняе свой генетычны код, а народ адчужаецца ад традыцый, звычаяў, духу продкаў, трапляе ў іншую духоўную атмасферу і свядома ці несвядома пакутуе.

Псіхолагі і сацыёлагі адзначаюць, што з'явілася новая маладзёжная культура, адрозная ад той, якая ўласцівая грамадству ў цэлым. Сярод маладых людзей распаўсюджваюцца свае густы, традыцыі, жаргон. Адбываюцца змены і ў маралі.

Пераканацца ў тым, што моладзь знаходзіцца ў маральным запусценні, можна дзе заўгодна: у грамадскім транспарце, на вуліцы, у школах і вышэйшых навучальных установах. Гэтае запусценне выяўляецца ў непрыстойных паводзінах, публічным курэнні, ўжыванні спіртных напояў, залішней раскаванасці і інш. І не дастаткова проста гэта падкрэсліваць, выяўляць, забараняць або загадваць, як рабіць правільна. Трэба здолець зірнуць на праблемы і клопаты моладзі з іх пункту гледжання. А яшчэ лепш прааналізаваць сябе, свае крытэрыі маралі, свае ўчынкі, паказаць уласны прыклад. Але зрабіць гэта талерантна, без прымусу.

Для значнай часткі моладзі, у прыватнасці студэнцкай, характэрныя беднасць лексікі, слабое развіццё вербальнага інтэлекту, непісьменная пабудова фраз, няўменне выразна сфармуляваць асноўныя тэзісы, разгарнуць лагічную аргументацыю.

Полесгу

Гэта звязана яшчэ з адной вялікай праблемай, якая ў апошні час набыла размах і характар эпідэміі – гэта нежаданне вучыцца. А яшчэ нежаданне моладзі чытаць мастацкія творы. Яны не толькі не чытаюць праграмныя творы, але і не любяць чытаць наогул.

Моладзь не разумее, што чым больш чалавек прачытвае або праслухоўвае, тым больш цікавей ён становіцца як чалавек і суразмоўца. Новыя веды адкрываюць новыя гарызонты для разважанняў. Дзякуючы кнігам чалавек больш разумее, больш бачыць, чым астатнія, становіцца больш мудрым.

За апошнія гады сярод моладзі вызначыліся новыя каштоўнасці, не навязаныя выкладчыкамі, бацькамі. Бо той шквал фільмаў–баевікоў, нізкагатунковых тэлесерыялаў, музычнай прадукцыі сумніўнай якасці, які апанаваў кіно– і тэлеэкраны, спрыяў з'яўленню і ўкараненню культу такога сабе супергероя з напампаваным біцэпсамі, моцнымі кулакамі і тугім кашальком.

Жывучы ў матэрыяльным свеце і клапоцячыся толькі рацыянальным і тэхнічным удасканаленнем жыцця, мы губляем жыццё духоўнае, унутранае.

Клапоцімся пра здароўе цела, клапоцімся аб прадухілення і папярэджання любых хвароб і адначасова грэбуем духам, пастаянна забіваем яго чужой мовай, чужой інфармацыяй, чужымі ідэямі, намерамі і мэтамі. І гэта вялікая праблема.

Але нават у гэтых умовах нельга адчайвацца. На долю сучаснай моладзі выпала сур'ёзнае выпрабаванне: жыць у эпоху пераменаў, тым не менш, сярод людзей, якія прагнуць улады і сытага, шчаснага быцця "тут і цяпер", сярод ашчадных і бяздушных, сярод апалітычных і абыякавых да лёсу роднай мовы і культуры ёсць сапраўдныя носьбіты нацыянальнай духоўнасці. Сённяшняя вера ў будучыню, у поспех пераўтварэнняў, у сваю надзею і апору – маладыя сілы – вырастае не на пустым месцы, таму што чыстыя духам і целам, добрыя і моцныя, рамантычныя і мэтанакіраваныя маладыя людзі – яны заўсёды былі і будуць у нашым грамадстве.

Полесгу